**Список цитируемых источников**

1. *Пронин, В. А.* Современный литературный процесс за рубежом : учеб. пособие / В. А. Пронин. — М. : Логос, 2012. — 260 с.
2. *Мжельская, А. С.* Мотивы зрительных ощущений в новеллистике П. Зюскинда / А. С. Мжельская // Вестн. Самар. гос. ун-та. — 2007. — № 5/3. — С. 54—59. — (Серия «Литературоведение»).

УДК 821.161.3-31.09

**К. Ю. Гарбачова**
*Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», Віцебск*

# ІДЭЙНА-МАСТАЦКАЯ СПЕЦЫФІКА АПАВЯДАННЯЎ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

**Уводзіны.** Сярод творчай беларускай інтэлігенцыі ў літаратуры дарэвалюцыйнай пары няма іншай больш каларытнай постаці, як Максім Багдановіч. Ён — яскравы прадстаўнік XX стагоддзя, класік, празаік, паэт і перакладчык.

**Асноўная частка.** Творчасць Максіма Багдановіча ўспрымаецца сёння як узорная, класічная, універсальная. У гісторыі беларускай літаратуры яна з'яўляецца яскравым прыкладам наватарства — канструктыўнага адмаўлення традыцыі, творчага развіцця лепшых дасягненняў сусветнай літаратуры.

Сваёй дзейнасцю Максім Багдановіч унёс вялікі ўклад у станаўленне беларускай літаратуры. Пісьменнік адлюстраваў у апавяданнях духоўнае жыццё эпохі, закранаў важныя грамадскія пытанні свайго часу, у тым ліку і пытанні сапраўднай маральнай прыгажосці чалавека, што не страціла сваёй значнасці і да нашых дзён. Творчая спадчына Максіма Багдановіча з'яўляецца не толькі праявай багатай інтэлектуальнай дасведчанасці, але і смелым прыкладам у кантэксце нацыянальнай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Канцэптуальная ўстаноўка паэтычнай эстэтыкі мастака створана на сумежжы навукі і мастацтва, сінтэзе рацыянальнага і эмацыянальнага. Наватарская па сваёй сутнасці, творчасць Максіма Багдановіча стала адмысловай эпохай у далейшым духоўна-культурным развіцці беларускай нацыі.

У айчынным літаратуразнаўстве мастацкая проза Максіма Багдановіча вывучана яшчэ недастаткова поўна, што тлумачыцца многімі прычынамі. Адна з іх у тым, што шырокая папулярнасць Багдановіча як выдатнага паэта і перакладчыка міжвольна адбілася на ўспрыманні яго празаічных твораў. На наш погляд, выключэннем сталі хіба што апавяданні «Музыка», «Апокрыф», «Сон-трава», у якіх выкладаецца эстэтычнае крэда пісьменніка, яго погляды на ролю і месца мастацтва ў жыцці народа.

Яшчэ трэба мець на ўвазе і тое, што многія празаічныя творы Багдановіча на працягу доўгага часу заставаліся невядомымі даследчыкам і чытачу. Проза Максіма Багдановіча адметна тым, што аўтар не паўтараў вядомых на той час ідэйна-мастацкіх схем з адпаведных узораў Якуба Коласа, Ядвігіна Ш., Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі, а імкнуўся ісці сваёй дарогай, шукаў сваю тэму, якая стала для яго тэмай адухоўленай Красы, самаадданага служэння мастака свайму народу.

Апавяданні пісьменніка з'яўляюцца рэалістычнымі, цесна звязанымі з канцэпцыяй нацыянальнага адраджэння беларусаў. Любоў да Радзімы — адна з галоўных тэм апавяданняў Багдановіча. Аўтар паказвае моцную сувязь простых людзей з Беларуссю, роднай зямлёй. Яго творы насычаны багаццем рэчавага, прадметнага свету і шматаспектнай эпічнай інтанацыяй. Трэба адзначыць, што ў празаічных творах Максіма Багдановіча рознабакова раскрываецца эстэтычна-філасофская канцэпцыя жыцця, з чым карэлюецца пэўная канструктыўнасць, рацыянальная выяўленасць ідэі твора. Так, у апавяданні «Музыка» Багдановіч сцвярджаў актыўную грамадскую ролю мастацтва, звязанага з народным жыццём, яго вялікую сілу ўздзеяння на жыццё, неўміручасць. У апавяданні «Апокрыф» аўтар паказвае народную патрэбу ў мастацтве, у разуменні харства як фактару духоўнага ўзбагачэння, жыццядзейнасці чалавека, узаемадзеянне традыцыйнага і наватарскага як закон мастацкага развіцця, мастацкай уласцівасці. У апавяданні «Шаман» Багдановіч сцвярджае чалавечую прагу мары, духоўнай вышыні. У празаічных творах беларускага класіка заўважаецца паэтычнасць аўтарскага светаадчування, імкненне адкрыць светлае, інтэлектуальнае ў дзяцінстве, жаночай душы, свеце народных песняроў, у прыродзе, мастацтве, нацыянальнай гісторыі, гармоніі жыцця, багацці яго праяўленняў. Абвострана ўспрымаюцца і драматычныя, трагічныя аспекты жыцця — у лёсе народных талентаў ва ўмовах несправядлівага грамадства, у вайне з яе смяротным вынікам, у перыпетыях кахання, нечаканасці дзіцячых страт, раптоўнасці пераходу ад радасці да бяды.

Сваімі апавяданнямі аўтар пашыраў жанравыя межы беларускай прозы пачатку XX стагоддзя, у якой тады моцна адчуваліся этнаграфізм, натуралістычнае бытапісальніцтва. Гэтыя рысы ўносілі ў яе свежы струмень, новыя фарбы. Тэма мастацтва як з'ява духоўнага парадку (апавяданні «Вясной», «Марына»), тэма красы (апавяданні «Музыка», «Апавяданне аб іконніку і залатару»), што ўзвышае чалавека, сваё вобразнае ўвасабленне знаходзілі не толькі ў творчых формах, аснову якіх Багдановіч

© Гарбачова К. Ю., 2017

Репозиторий БарГУ

запазычваў з арсенала паэтычных жанраў ці са старажытнай пісьменнасці (апавяданне «Апокрыф»), але і з традыцыйных сюжэтных структур (апавяданне «Шаман»).

Максім Багдановіч сваімі творамі перш за ўсё прывіў беларускай літаратуры эстэтычныя якасці, якіх яна яшчэ не мела, раскрыў светаадчуванне простага чалавека, яго эмацыйнасць, асабістае багацце ўнутранага свету. Багдановіча цікавіла гісторыя Радзімы, якая таксама адлюстроўваецца ў творах. Ён захапляўся міфалогіяй з яе дзіўнымі вобразамі, напаўняў свае апавяданні філасофскімі роздумамі аб сутнасці Быцця.

**Заключэнне.** Максім Багдановіч стаіць у шэрагу тых першапачынальнікаў беларускага адраджэння, хто спрабаваў паказаць месца і ролю беларуса ў гісторыі і часе, сфармуляваць нашу нацыянальную ідэю, асэнсаваць шляхі далейшага развіцця суайчыннікаў. Заслуга Багдановіча заключаецца ў тым, што ён даследаваў не толькі беларускае, але і агульнаславянскае адраджэнне. У гістарычнай перспектыве класік бачыў незалежнасць кожнага народа, яго творчы росквіт, супрацоўніцтва. Пісьменнік быў адным з нямногіх, чые творы друкаваліся па-за межамі Бацькаўшчыны і былі шырокавядомыя.

У сваіх апавяданнях аўтар трактуе жыццё, аднаўленне прыроды ў ім як адвечную крыніцу хараства, а здольнасць чалавека адчуць, прасякнуцца ім — як здольнасць да вышэйшай асалоды, рух жыцця — як працэс узаемадзеяння прыроды і чалавека, паэтычнага і звычайнага, радаснага і балючага.

Максім Багдановіч — лепшы прадстаўнік беларускай літаратуры свайго часу. Ён уваходзіць у шэраг вялікіх творцаў свету як роўны сярод роўных.

УДК [821.162.1+821.161.1]-343.4.09

**В. Ю. Горохова**
*Учреждение образования «Витебский государственный университет имени П. М. Машерова», Витебск*

## ЖАНР СКАЗКИ В ПОЛЬСКОМ И РУССКОМ ФОЛЬКЛОРЕ: СРАВНИТЕЛЬНО-СОПОСТАВИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ

**Введение.** Отношения между Россией и Польшей нельзя назвать простыми, так как часто история этих государств переплеталась, сопровождаясь то военными конфликтами, то временами хрупкого перемирия. Это не могло не повлиять на культуры обеих стран, на такие её составляющие, как национальный язык, фольклор, литература, которые определяют лицо нации, её духовное наследие. Народная культура — это многовековой опыт народа, кристаллизованный в его традициях, верованиях, обрядах, материализованный в предметах искусства, труда и быта. В сложных исторических условиях особая роль (как у поляков, так и у россиян) отводилась устному народному творчеству. Актуальность исследования заключается в том, что именно через фундаментальные жанры устного народного творчества, такие как сказка, можно проследить индивидуальный путь духовного становления той или иной нации. Благодаря народным сказкам мы можем определить, как разные народы относятся к проблемам нравственности. Сказка — один из самых значительных фольклорных жанров. Как известно, «сказочная фантастика, выраженная в специфических формах, с особой остротой выражает устремления народа, его мечты, желания, надежды» [1, с. 45]. Данный жанр устного народного творчества достаточно хорошо изучен литературоведами. Цель нашего исследования: выявить общие и отличительные черты польской и русской сказки, сравнить сюжеты, мотивы, основные образы.

**Основная часть.** В сказках о животных, которых в польском фольклоре преобладающее большинство, чаще всего побеждает дружба, зло наказывается, слабый хитростью одолевает сильного. Так, в сказке «Баран и волк» барану удается провести волка, а в сказке «Конь, вол, петух, кот и рак» животные выгоняют из избы чертей. То же самое наблюдается и в русской сказке («Волк и семеро козлят», «Кот, петух и лиса»). Отношения положительных героев в бытовой сказке, равно как и в волшебной, строятся на принципах добрососедства и взаимопомощи: персонажи держат своё обещание и помогают попавшим в беду. Однако некоторым польским сказкам присущ шутливый конец при собственно трагической развязке сюжета. Так, в сказке «Кот и курица», идентичной русской народной сказке «Кот, петух и лиса», кот, увидев курочку, которую он неоднократно пытался спасти, зажаренной, с горя съедает её. «Заимствование всегда совершается путем сложнейшего процесса “органической” переработки заимствуемого сюжета или мотива в новой воспринимающей среде. При этом сказка подвергается, прежде всего, действию закона бытового и социального переосмысления, национально-социальной акклиматизации. Попадая к разным классам, сказка облекается в конкретные образы, тенденции и целеустановки враждующих и борющихся классов, подменивая соответственно мотивы, эпизоды, образы, цели» [2]. Тот же мотив победы слабого над сильным встречается и в бытовых

© Горохова В. Ю., 2017

Репозиторий БарГУ